МАРКЕРЫ ПЕРАХОДУ Ў РЭТРАСПЕКТЫЎНУЮ ПРАСТОРУ Ў МАСТАЦКІМ ТЭКСЦЕ

В. П. Дзігадзюк
МДПУ імя І. П. Шамякіна

На дадзеным этапе існавання беларускага мовазнаўства вялікую цікавасць выклікае пытанне даследавання тэксту і тэкставай прасторы. Часавая арыентаванасць, якая адыгрывае важную ролю ў станаўленні сюжэту апавядання, звязана з катэгорыямі тэмпаральнасці і дыскантынуума. Таму вызначэнне маркераў актуалізацыі гэтых адзінак, а менавіта, катэгорыі рэтраспекцыі, прыцягвае ўвагу многіх даследчыкаў – К. В. Ліфанцьеву, І. Г. Сагіран, І. В. Ціўяеву, Л. Н. Фёдараву.

Сучасная мастацкая літаратура характарызуецца спецыфічнымі сінтаксічнымі канструкцыямі. Так, парцэляцыя, як кампазіцыйны прыём сінтаксічнага раздзялення тэксту, можа ўдзельнічаць у парушэнні кантынуума апавядання як прама, так і ўскосна. У такіх канструкцыях часавая прастора мінулага вызначаецца ў канкрэтызацыі, тлумачэнні, дапаўненні базавай часткі: І ў мяне перехапіла дыханне. Гэта была драўляная скульптура – менавіта наша, беларуская, непаўторная. Не пазней семнаццатага стагоддзя. Раскрыжаваныя Хрысты, каструбаватыя, нязграбныя. Святыя Дзевы са складзенымі на грудзях рукамі. Майсей з вялізнымі рагамі-прамянямі на галаве… (Л. Рублеўская) або ўказанні прычыны таго, аб чым гаворыцца ў асноўным кампаненце: Вельмі хачу намаляваць мокрага п’янага янота, які круціцца на поручні, як стрыптызёрка на шосце. Не наважваюся. Напалоханая я, спадарства. Адбілі ахвоту сцябацца (Л. Рублеўская).

Рэтраспектыўнасць парцэлята да асноўнай часткі або кропкі адліку можа вызначацца імпліцытна, на выснове логіка-асацыятыўнай аперацыі. Так, у наступнай канструкцыі парцыляванымі з’яўляюцца недапасаваныя азначэнні ў розных граматычных формах. Рэтраспектыўнасць вызначаецца ў семантыцы аднародных парцэлятаў, якія канкрэтызуюць версіі знікнення аднаго з галоўных персанажаў: І толькі не трэба мне вашых версій. Думаеце, хоць штосьці я не чула? Мафіёзныя разборкі (знайшлі мафіёзі з парай соцень даляраў капіталу). Прыбралі канкурэнты (такі з Віталя быў бізнесмен, як з тармазной калодкі арфа. Проста марыў, каб раз – і шмат грошай звалілася). Спецслужбы дасталі маладога апазіцыянера (ну, у пастарунку Віталь пару тыдняў калісь правёў, на мітынгах свяціўся, але калі ў грамадстве ўсё пасля плошчы патроху сціхла, сціх і ён. У палітыку не лез, бухцеў сабе на кухні, як спаконвеку ў інтэлігенцыі вялося). З’ехаў да каханкі (любімая версія маёй мамы). Вывез кантрабанду і жыве на Канарах. Быў прададзены на органы. Страціў памяць і ляжыць у нейкай замежнай

клініцы (версія Віталевай цётухны, адзінай радні). Трапіў у рабства, магчыма, сэксуальнае (хаха). Іншапланецян і паралельныя сусветы пакінем паза падазрэннямі (Л. Рублеўская).

Іншы раз маркерам адсылу ў мінулае з'яўляюцца сінтаксічныя ўстаўкі. У такіх выпадках паказчыкам рэтраспектыўных адносін выступаюць розныя значэнні канструкцый, якія здольны аднесці чытача ў іншую часавую прастору на фоне базіснага часу. Так, пры дапамозе ўстаўкі аўтар можа ўводзіць звесткі тлумачальна-ўдакладняльнага характару з указаннем часу: Доўгія рудаватыя валасы, а калі я заплятала яму іх у таненькія коскі, тамсям на скуры галавы бачыла невялікія белыя шнары ***(«Любіў у дзяцінстве пабіцца***») (Л. Рублеўская); Уначы двор каралевы-маці быў абкружаны стражнікамі, і, нягледзячы на гнеў яе і тупатанне, ад якіх ціхія вулачкі каралеўскага замка ажно трамцелі, вышэйшыя саноўнікі каралеўства ўвайшлі ў пакой да княгігі Беаты і , не застаўшы яе ***(тым часам яна ўцякла і схавалася ў лазні)****, павялі да выхаду маладую князёўну, ласкамі ды ўгаворамі стараючыся схіліць яе да шлюбу* (В. Іпатава.) або паказаць адносіны персанажа да падзеі: Пакет я разадрала проста на ганку, пад стрэшкай перад непрыветным пад'ездам ***(я так і не змагла ўявіць, што Корвус сюды заходзіў, падымаўся па вышчарбленых прыступках, вячэраў на цётчынай кухні)*** *»)* (Л. Рублеўская). У падобных канструкцыях рэтраспектыўнасць рэалізуецца пры дапамозе розных лексічных, граматычных, сінтаксічных сродкаў.

Цікавымі для даследавання з'яўляюцца інтэртэкставыя ўключэнні як сродкі рэпрэзентацыі рэтраспекцыі. Намі вылучаецца алюзія, якая адыгрывае значную ролю ў арганізацыі тэкставага прастору, а менавіта, з'яўляецца імпліцытнай актуалізацыяй зруху на часавай плоскасці ў прошлае. Рэтраспектыўнасць адбываецца з улікам таго, што адрасат валодае інфармацыяй аб жыцці або падзеях звязаных з тым чалавекам, чыё імя было згадана і аўтаматычна ў думках накіроўваецца ў іншую часавую плоскасць. Гэта тлумачыцца тым, што асноватворным фактарам аднаўлення мінулых вобразаў, якія ў думках асацыіруюцца з пэўнымі часава-прасторавымі падзеямі, з'яўляецца памяць. Таму ўсе факты, дзеянні, што актуалізуюцца ў памяці чалавека, з'яўляюцца рэтраспектыўнымі. Так, наступны прыклад нагадвае нам вядомае ўсім беларусам з гісторыі паданне пра полацкую князёўну Рагнеду, з якой звязана сапраўдная трагедыя, гібель Полацка і заснаванне цяперашняга Заслаўя: А інакш нельга ў гэтым злосным, несправядлівым свеце. Вось бацька – як яму хочацца пры яе дапамозе дабіцца нечага свайго! <…> Гордая Рагнеда не захацела аднойчы разуць свайго нарачонага – прымусілі. І яе змогуць! Мячом адваюць – і, як Рагнеду*, у далекія кіеўскія землі памчаць (*(В. Іпатава).

Намі адзначана, што зрух у часавым кантынууме рэалізуецца пры ўмове, калі маркерамі алюзіі з'яўляюцца антрапонімы: Ведаеш, што НаркевічаЁдку называлі лоўчым маланак – за ягоныя эксперыменты з электрычнасцю, падобныя да тых, што рабіў Тэсла?» *)*(Л. Рублеўская*);* Я не Пенелопа. *У мяне пасля столькі было каханкаў...* (Л. Рублеўская*);* Палец нервова трэ лоб, наўскос, нібыта намацвае шнар, як у Гары Потэра… (Л. Рублеўская).

Такім чынам, алюзія, як паказвае аналіз мастацкіх тэкстаў, – інтэртэкстуальная адзінка, якая змяшчае відавочнае паказванне на гістарычны факт у тэкставай культуры і тым часам з'яўляецца маркерам рэтраспектыўнасці нейкіх падзей ў кантынууме апавядання.

Назіраюцца выпадкі, калі цытата – форма інтэртэкстуальнасці – можа ўдзельнічаць у рэпрэзентацыі дыскантынуума. Гэта залежыць ад лексіка-семантычных адносін адзінкі да моманту гутаркі, што ўказвае на парушэнне паслядоўнага разгортвання падзей*:* Калісь палітэмігрант Войніч, муж той самай Этэль Ліліян, што стварыла рэвалюцыянера-неўрастэніка Авадня, у якога і я ў тынэйджараўскім узросце была закаханая, набыў у Ватыкане трактат. Напісаны на пергаменце на неіснуючай мове, упрыгожаны падрабязнымі каляровымі малюначкамі раслін, сузор'яў, істот, збудаванняў і пейзажаў, як вы здагадваецеся, таксама неіснуючых. Магчыма, пятнаццатае стагоддзе, магчыма, пазнейшая падробка, але «з тых часоў бянтэжыць розумы людзей і робатаў». Прынамсі, Салома згадваў, што ў юнацтве біўся над расшыфроўкай. Нават хакнуў для гэтага нейкія суперзасакрэчаныя базы дадзеных, дзе – не прызнаўся. Спадзяюся, не ў Ватыкане (Л. Рублеўская).

Іншы раз назіраецца пераход у іншую часавую прастору пры пераказе чужога тэксту ў новым тэксце. Гэты прыём звязаны з уключэннем (устаўкай) рэтраспектыўнай тэкстаструктуры ў асноўны план апавядання: Легенду тую ведалі ўсе, але ўгаварылі Марціна расказаць пра яе яшчэ раз. Цёплая майская ноч з пахам старых ліп *і* маладых клейкіх лістоў таполі плыла над Нясвіжам, з плёскатам неслася рачулка Уша, уздоўж якой яны ішлі <…> (В. Іпатава) Як бачым, дыскантынуум апавядання адбываецца з удзелам матываванага фактару *("легенда", "расказаць"),* які эксплiцытна падводзіць да пераходу ў процілеглую часавую плоскасць.

Праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць наступныя высновы. Катэгорыя рэтраспекцыі ў мастацкім тэксце актуалізуецца эксплiцытна і імплiцытна, у залежнасці ад ступені выражаннасці маркераў. Сінтаксічныя сродкі рэпрэзентацыі дыскантынуума апавядання прадстаўлены структурна-графічнымі вылучэннямі – парцэляцыя**й**, **у**стаўка**й і** інтэртэкставымі ўключэннямі – **алюзіяй,** цытатай, пераказам чужога тэксту. Адносіны, якія прадвызначаюць гэтыя **рэтраспектыў-**

ныя тэкстаструктуры да базавай часткі, розныя па характару – тлумачальна-ўдакладняльныя, дапаўняльныя, прычынныя і інш. У другіх выпадках пераход у іншую часавую прастору звязаны з лексіка-семантычнымі адценнямі маркераў і здольнасцямі памяці чалавека звяртацца ў прошлае. Такім чынам, сінтаксічная актуалізацыя рэтраспекцыі ў мастацкім тэксце прадстаўляе вялікую цікавасць, што прадвызначае далейшае яе вывучэнне ў беларускім мовазнаўстве.

Бібліяграфічны спіс

1. Лифантьева, Е. В. Реализация текстовой категории ретроспекции в англоязычном художественном тексте : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Е. В. Лифантьева ; Моск. гос. ин-т им. М. В. Ломоносова. – М., 2009. – 17 с.
2. Сагирян, И. Г. Вставка как средство выражения категорий ретроспекции и проспекции в художественном тексте / И. Г. Сагирян // Балт. гуманитар. журн. – 2015. – № 3. – С. 29–32.
3. Тивьяева, И. В. Ретроспективные сверхфразовые единства: формы и функции : дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / И. В. Тивьяева. – Тула, 2007. – 175 с.
4. Федорова, Л. Н. Категория ретроспекции в художественном тексте: на материале английского языка : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Л. Н. Федорова ; Моск. гос. пед. ин-т иностр. яз. – М., 1982. – 21 с.